# ДЭРЫВАЦЫЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ Ў САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАЙ ЛЕКСІЦЫ АНГЛАМОЎНАГА ПАХОДЖАННЯ (СЕМАНТЫКА-СЛОВАЎТВАРАЛЬНЫ АСПЕКТ)

**Савасцюк М.Л.**

***Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт***

***Анатацыя:*** у артыкуле разглядаюцца некаторыя дэрывацыйныя працэсы ў корпусе сацыяльна-палітычнай лексікі беларускай мовы: удакладняюцца спосабы ўтварэння прыметнікаў ад англіцызмаў-назоўнікаў, фіксуюцца семантычныя і граматычныя характарыстыкі матывавальных слоў.

***Ключавыя словы:*** англіцызм, дэрывацыя, запазычанне, прыметнік, сацыяльна-палітычная лексіка, словаўтварэнне, суфікс.

Мова з’яўляецца носьбітам інфармацыі аб жыцці соцыума і яго люстэркам. У ёй астаўляюць свой адбітак усе працэсы, што маюць месца ў розных сферах жыцця грамадства. Сацыяльна-палітычная лексіка, як непасрэдна звязаная з ім, прадстаўляе асаблівую цікавасць. Змены, што адбываюцца ў гэтай лексіка-семантычнай групе, фіксацыя ў ёй новых запазычанняў, усебаковае вывучэнне працэсаў іх адаптацыі дапамагаюць раскрыць храналогію і сутнасць не толькі зрухаў, што адбываюцца на розных узроўнях мовы, але і ў свядомасці і жыцці грамадскасці.

У беларускай мове корпус сацыяльна-палітычнай лексікі англамоўнага паходжаня налічвае 557 адзінак (каля 15 % ад агульнай колькасці англіцызмаў, якіх больш за 3600 адзінак [5]). У групу ўваходзяць як лексемы непасрэдна запазычаныя, так і іх дэрываты. 93 англіцызмы (з якіх усе вылучаюцца як назоўнікі (N)) з’яўляюцца матывавальнымі для новых слоў; некаторыя з іх фарміруюць даволі вялікія словаўтваральныя гнёзды і значна пашырылі склад разглядаемай намі лексіка-семантычнай групы. 85 з іх матывавальныя для адносных прыметнікаў з агульным словаўтваральным

значэннем ‘які мае адносіны да таго, што названа матывавальным словам’. Словаўтваральныя суфіксы, прыстаўкі і г.д. з’яўляюцца асноўнымі носьбітамі словаўтваральнага значэння ў семантычнай структуры матываванага слова [3, с. 188], таму важна вылучыць гэтыя фарманты і вызначыць найбольш актыўныя з іх, а таксама выявіць семантычныя і граматычныя катэгорыі матывавальных слоў англамоўнага паходжання.

| Семантыка-граматычная словаўтваральная мадэль | Словаўтваральны фармант | Матываваныя словы | Колькасць матываваных адзінак |
|---|---|---|---|
| N. адуш.<br><br>(назва асобы па роду дзейнасці) | -ск- | Байкерскі. Гангстарскі. Джэнтльменскі. Дыгерскі. Іміджмейкерскі. Інсайдарскі. Кілерскі. Лідарскі. Плэйбойскі. Пурытанскі. Пэрскі. Рэйверскі. Рэкецірскі. Свінгерскі. Спікерскі. Спічрайтарскі. Флэшмоберскі. Хіпстарскі. Хуліганскі. | 19 |
| N. неадуш. (назва плыні, установы) | -ск- | Каледжскі. Мальтузіянскі. Фабіянскі. | 3 |
| N. адуш.<br><br>(назва асобы па роду дзейнасці) | -цк-<br><br>(дзе *ц* з’яўляецца адначасова складнікам кораня і суфікса або двух суфіксаў) | Бойскаўцкі. Лейбарысцкі. Рэспандэнцкі. Скаўцкі. | 4 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| N. неадуш.<br><br>(назвы плыней, галоўным чынам, утвораных пры дапамозе суфікса -ізм) | -цк-<br><br>(дзе *–ц-* з’яўляецца адначасова складнікам двух суфіксаў) | Джынгаісцкі. Ізаляцыянісцкі. Лабісцкі. Макартысцкі. Парламенцкі. Сексісцкі. Снабісцкі. Трэд-юніяністцкі. Чартысцкі. | 9 |
| N. неадуш.<br><br>(назва плыні, з’явы) (усе назвы, утвораныя ў англійскай мове пры дапамозе фарманта -ing) | -ав- | Брэндавы. Іміджавы. Кансалтынгавы. Кемпінгавы. Кланавы. Краўдфандынгавы. Ліліпутавы. Маніторынгавы. Мэйнстрымавы. Панкавы. Прэсінгавы. Рэйдавы. Рэйтынгавы. Трэкінгавы. Трэндавы. Тэставы. Фліртавы. Фэйкавы. Хостынгавы. Шопінгавы. | 20 |
| N. неадуш.<br><br>(назва плыні, з’явы) | -ов- | Мітынговы. Пікніковы. Хіповы. | 3 |
| N. неадуш.<br><br>(назва плыні, з’явы) | -н- | Андэграўндны. Аўральны. Гендарны. Гламурны. Дыскамфортны. Дэтэктыўны. Інаўгурацыйны. Інтэрактыўны. Камфортны. Карпарацыйны. Клубны. Лакаўтаваны. Масмедыйны. Медыйны. | 22 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | Мэйнстрымны. Пікнічны. Піярны. Стандартны. Сэрвісны. Фостарны. Хоспісны. Эскалацыйны. | |
| N. неадуш.<br><br>(назвы плыней, арганізацый і з’яў) | -аўск- | Грынпісаўскі. Куклукскланаўскі. Лендлізаўскі. Мэйнстрымаўскі. Натаўскі. Панкаўскі. Пентагонаўскі. Пэн-клубаўскі. Піяраўскі. Скінхедаўскі. | 10 |
| N. неадуш.<br><br>(назвы плыней, і з’яў) | -ычн- | Снабістычны. | 1 |
| N. адуш.<br><br>(назвы асоб па роду дзейнасці) | -ават-<br><br>(са значэннем ‘які валодае рысамі таго, што названа матывавальным словам’) | Панкаваты. | 1 |
| N. адуш.<br><br>(назва асобы па роду дзейнасці) | -іст-<br><br>(са значэннем ‘які валодае рысамі таго, што названа матывавальным | Хуліганісты (утварае ступені параўнання пры дапамозе слоў *больш / болей* і *менш / меней*). | 1 |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | словам’) | | |

Такім чынам, усе прыметнікі англамоўнага паходжання сацыяльна-палітычнай сферы можна вызначыць як адносныя адсубстатыўныя суфіксальныя прыметнікі. З табліцы відавочна, што для прыметнікаў, матываваных назвамі асоб па роду дзейнасці найбольш прадуктыўным з’яўляецца фармант -ск-, назвамі плыней і з’яў -ав-, -н-. Вылучаюцца некалькі гнёздаў з словаўтваральнымі сінонімамі: *мэйнстрымавы – мэйнстрымаўскі – мэйнстрымны*; *панкавы – панкаўскі*; *пікніковы – пікнічны*; *снабістычны – снабісцкі*; *хуліганскі – хуліганісты*.

## ЛІТАРАТУРА

1. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў: у 2 т. / А. М. Булыка. – Мінск : БелЭн, 1999. – 2 т.

2. Булыка, А. М. Слоўнік іншамоўных слоў. Актуальная лексіка / А. М. Булыка. – Мінск : ТАА «Харвест», 2005. – 336 с.

3. Лукашанец А. А. Праблемы сучаснага беларускага словаўтварэння / А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 315 с.

4. Піскуноў, Ф. А. Вялікі слоўнік беларускай мовы : арфаграфія, акцэнтуацыя, парадыгматыка : каля 223 000 слоў / Ф. А. Піскуноў. – Мінск : Тэхналогія, 2012. – 1207 с.

5. Савасцюк, М. Л. Англіцызмы беларускай мовы : дапаможнік / М. Л. Савасцюк. – Мінск : БДУ, 2019. – 391 с.

6. Уласевіч, В. І. Слоўнік новых слоў беларускай мовы / В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч. – Мінск : ТетраСистемс, 2009. – 448 с.

7. Уласевіч, В. І. Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэння слоў / В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч. – Мінск : Аверсэв, 2013. – 253 с.

8. Шчасная, К. Д. Слоўнік новай і актуальнай лексікі / К. Д. Шчасная; пад рэд. В. П. Русак. – Мінск : Права і эканоміка, 2012. – 102

c.